■ Напярэдадні падзеі

# ВЯРНУЦЬ ПАЗІЦЫІ

## Заўтра стартуе матч 2 круга II групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса

**На адкрытых кортах Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе ў Мінску сустрэнуцца зборныя Беларусі і Латвіі. У папярэдняй заяўцы на матч у нашай камандзе Ілья Івашка, Андрэй Васілеўскі, Яраслаў Шыла і Аляксандр Буры. Праз траўму спіны не згуляе першая ракетка зборнай Ягор Герасімаў.**




У рэйтынгу ATF беларусы на 45-м месцы, латышы — 48-я, таму гульні ў Мінску чакаюцца вельмі напружанымі і займальнымі.

*— Я веру ў гэты склад. І гэтым складам мы гатовыя выходзіць, змагацца і перамагаць, — адзначае* **капітан беларускай зборнай Уладзімір ВАЎЧКОЎ**. *— Мне падабаецца тое, што я бачу ў апошнія некалькі месяцаў на трэніроўках. Ужо паспеў паглядзець пару занятках латышоў: яны паказваюць добры, цікавы, бескампрамісны тэніс. Усе разумеюць, што не бывае простых матчаў у фармаце Кубка Дэвіса, таму мы настройваемся на добрую працу. Хлопцы славалюбівыя, амбіцыйныя, яны ўжо хочуць увайсці ў Сусветную групу і змагацца за прызнанне, — адзначыў Ваўчкоў.*

У складзе гасцей — Мікеліс Лібіеціс, Марцінш Подзуш, Яніс Подзуш і Мікус Лосбергс, капітан каманды — Карліс Лейніекс. Латышы яшчэ ў нядзелю прыбылі ў Мінск, апрабавалі сталічныя корты і засталіся задаволеныя іх якасцю.

*— Мы вельмі рады знаходзіцца тут. Пакуль нам усё падабаецца, мы любім хуткія корты. Вашы гульцы зараз трошкі вышэйшыя па рэйтынгу, але няма перашага нумара. Я думаю, узровень у двух камандаў прыкладна аднолькавы, таму барацьба да 4—5 сэтаў абавязкова будзе, — расказаў Карліс Лейніекс.*

У выпадку перамогі над латышамі наша каманда ў трэцім раўндзе згуляе з пераможцам пары Фінляндыя — Данія.

Нагадаем, свой шлях беларуская зборная ў Кубку Дэвіса пачала ў 1994-м. Праз дзесяць гадоў нашы хлопцы ўварваліся ў Сусветную групу гэтага турніру. Тады тэнісны свет з цікавасцю назіраў за славянскім супрацьстаяннем Беларусь — Расія: на корце разгарнуліся сапраўды драматычныя падзеі, дзе наша краіна аказалася мацнейшай. Гэты час ужо прынята называць «залатым» у мужчынскім беларускім тэнісе. У чвэрцьфінале наша зборная не пакінула ніякіх шанцаў зборнай Аргенціны (5:0), але ў паўфінале беларускіх тэнісістаў чакаў адзін з наймацнейшых сапернікаў — ЗША (амерыканскія тэнісісты атрымалі ў турніры найбольшую колькасць перамог за ўсё існаванне турніру). Нашы хлопцы нічога не змаглі супрацьпаставіць амерыканцам. Тым не менш гэты вынік (паўфінал Кубка Дэвіса) і сёння з'яўляецца найлепшым дасягненнем беларускай зборнай на гэтым турніры.

З 2008 па 2010 год наша каманда выступала ў І групе Еўра-Афрыканскай зоны, а затым і зусім перамясцілася ў ІІ групу, пацярпеўшы запар серыю паражэнняў з боку Італіі (0:5), Нідэрландаў (1:4), а затым і Славакіі (1:4).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.56 | 21.34 | 16.38 |
| Віцебск — | 4.38 | 21.31 | 16.53 |
| Магілёў — | 4.46 | 21.24 | 16.38 |
| Гомель — | 4.51 | 21.12 | 16.21 |
| Гродна — | 5.13 | 21.48 | 16.35 |
| Брэст — | 5.22 | 21.40 | 16.18 |

**Месяц**

*Першая квадра 12.07—19.07.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

***Пр.** Ангеліны, Дзям'яна, Кузьмы, Пятра.*
***К.** Ангеліны, Ізабелы, Якуба.*

## ЗАЎТРА






Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Інфарм-укол

# ПАМЯТКА ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

**Хто павінен адказваць за здароўе дзяцей? Бацькі, вядома. Зразумела, што іх уласны лад жыцця вельмі моцна будзе ўплываць на нашчадкаў. Калі вы самі грэбуеце сваім здароўем, не выглядаеце здаровымі, то ў вас проста няма шанцаў заахвоціць маладое пакаленне на здаровы лад жыцця. Майце на ўвазе, што чым раней малое даведаецца аб карысных звычках, тым лепш.**

Што ж трэба рабіць, каб не страціць самае каштоўнае, што ёсць у кожнага з нас? Неабходна адмовіцца ад курэння, злоўжывання алкаголем (не кажучы пра наркотыкі); падтрымліваць аптымальны рухальны рэжым; рацыянальна харчавацца; загартоўвацца; вытрымліваць асабістую гігіену; дарыць сабе станоўчыя эмоцыі. Для здароўя сям'і ў цэлым варта дадаць яшчэ два моманты: добры псіхалагічны клімат (дзе пануюць узаемапавага, жаданне дзяліцца сваімі праблемамі) і сумеснае баўленне вольнага часу (заняткі спортам, турпаходы, прагулкі, наведванні музеяў, экскурсій).

— Стаўленне да жыцця пачынае фарміравацца вельмі рана і залежыць, у першую чаргу ад тых, хто знаходзіцца з намі, пакуль мы малыя, большую частку часу, — кажа псіхолаг, дружалюбнага падлеткам цэнтра «Поспех» Кацярына БЛІЗНЮК. — Нашы дзеці назіраюць, вывучаюць і эксперыментуюць. Усё, што адбываецца ў сям'і, так ці інакш «убіраецца». Таму кожнае ваша ўказанне павінна падмацоўвацца зразумелым тлумачэннем — навошта, для чаго. Матэрыял засвойваецца лягчэй, калі не забываецца на пахвалу...

- ✓ Запішыце дзіця ў спартыўную секцыю.
- ✓ Узмацняйце яго самаацэнку і ўпэўненасць, хваліце.
- ✓ Растлумачце, што цыгарэты і алкаголь — тое, на чым некаторыя людзі нядрэнна зарабляюць.
- ✓ Развівайце ў дзіцяці адказнасць.
- ✓ Не палохайце, але і не падтрымлівайце ілюзію ідэальнага свету.
- ✓ Парайце быць вельмі асцярожным у віртуальным свеце.
- ✓ Нагадайце аб неабходнасці звяртацца па дапамогу да вас, калі штосьці здаецца падазроным.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

Даты | Падзеі | Людзі

**14 ЛІПЕНЯ**

**1891** год. Нарадзіўся Пётр Апанасавіч Бузук, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук (1924), прафесар (1925). У 1916 годзе скончыў Адэскі ўніверсітэт. Аўтар першага дыялекталагічнага атласа беларускай мовы «Вопыт лінгвістычнай геаграфіі Беларусі». З 1926 года ўзначальваў Дыялекталагічную камісію Інбелкульта, у 1931-33 гадах дырэктар Інстытута мовазнаўства АН Беларусі і загадчык кафедры ў Беларускім дзяржаўным вышэйшым педагагічным інстытуце. Памёр у 1943 годзе.

**1911** год. Нарадзіўся Павел Іванавіч Пруднікаў, беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. У 1937 годзе скончыў Ленінградскі педагагічны інстытут. Працаваў у перыядычных выданнях, на радыё. У 1937 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе. Аўтар зборнікаў паэзіі «Час майго нараджэння», «Паэнія ягады», «Алеі», паэмы «Таймыр». Выступаў як публіцыст. Памёр у 2000 годзе.

**1966** год. У Оршы адкрыўся мемарыяльны комплекс «Кацюша». Афіцыйная назва — «За нашу Савецкую Радзіму!» Створаны ў гонар першага залпа новых рэактыўных мінамётаў («кацюш») 14 ліпеня 1941 года ў Вялікую Айчынную вайну па варожых войсках, якія сканцэнтраваліся на станцыі Орша.



Было сказана

**Кастусь КІРЭЕНКА, паэт:**

*«Як часта так здараецца ў жыцці,*
*Што ўжо калі цябе*
*Зусім надзея кіне, —*
*Знаходзіш той жаданы скарб адзіны,*
*Што век шукаў і ўсё не мог знайсці».*

***ПАВАЖАНАЯ Нэлі Леанідаўна Астрэйка!***

*Шчыра і сардэчна віншуем Вас з юбілейнай жыццёвай датай. Моцнага Вам здароўя, вялікага шчасця, вялікага шчасця, шчырасці сэрца. Няхай Ваша слова будзе сейбітам дабра і справядлівасці.*



*Няхай сонца ўдачы шчодра свеціць*
*І прыносіць кожны новы дзень*
*Творчае натхненне ў газеце*
*З сонечнаю назвай «Прамень»!*

**Калектыў дзяржаўнай установы «Рэдакцыя газеты «Прамень» і праграмы радыёвяшчання «Радыё Стоўбцы»**

## УСМІХНЕМСЯ

**Сантэхнік Сідараў падзьмуў на торт, і свечкі загарэліся.**

Сустракаюцца ў карчме два дырэктары, у аднаго ўвесь твар падрапаны, фінгал пад вокам.

— Слухай, — пытаецца пабіты, — у цябе няма добрай сакратаркі ў запасе?

— А што здарылася?

— Дык сход акцыянераў на носе, на працы завал — не паспяваю падрыхтавацца. Учора дадому прыйшоў, адразу за камп'ютар. Жонка мне вячэру прынесла, на стол паставіла. Я яе па заду пляснуў — дзякуй, кажу, Людачка.

— Ну і?

— Машачка яна ў мяне, Машачка...

**Пасля фразы жонкі «Так хочацца смажанай салёнай трускалкі» бацька семярых дзяцей страціў прытомнасць.**

Жонка — мужу:

— І пра што гэта ты з суседкай балбатаў?

— Дык, Ганула, аб надвор'і...

— Слухай сюды, сіноптык... Калі яшчэ раз з ёй пабач убачу — выпадзеш у асадак без штармавога папярэджання.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2784.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 ліпеня 2016 года.